# ЗМЕСТ

**Апошняе каханне князя Міндоўга**
*Гістарычная аповесць* . . . . . . . . . . . . . .3

**Здань Чорнага шляху**
*Гістарычна-прыгодніцкая аповесць* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 149

**Брыгіткі**
*Апавяданне* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 169

# АПОШНЯЕ КАХАННЕ КНЯЗЯ МІНДОЎГА

Гістарычная аповесць

## 1

Напярэдадні купалля ў лясах паблізу ад мазавецкае мяжы прыпыніліся на кароткі начлег перад наездам пятнаццаць тысяч коннай літвы і русі. Каб вецер не прынёс мазурам выратавальны для іх знак, абозныя на загад вялікага князя забаранілі кметам раскладаць вогнішчы. Адзіны на войска агонь цепліўся ля намёту Міндоўга; каля гэтага вогнішча радзіліся ўдзельныя князі, якія прывялі свае палкі і дружыны. Вялікі князь даводзіў ім задуму наезду. Міндоўг казаў, што яны мусяць адпомсціць мазурам за іхны ўдзел у леташнім сумесным з крыжакамі паходзе на прусаў і жмудзь. Палкі мусяць пранесціся смерчам праз мазурскія вёскі і мястэчкі ў бок Плоцка і недзе ля Віслы сустрэць войска князя Земавіта, калі той паспее яго сабраць...

Князёў ля агню, у крывавым полымі якога грэлася бства вайны, было разам з Міндоўгам семнаццаць, усе яны, апроч вялікага князя, былі паголеныя, як патрабаваў таго іхны ма-

лады ўзрост; сівы, барадаты Міндоўг выглядаў сярод іх дзедам, які склікаў моладзь для навучання поспеху і ўдачы на ўласным досведзе. Аднагодкі і старыя паплечнікі князя даўно пайшлі з жыцця, у крузе з ім, шасцідзесяціпяцігадовым, сядзелі іхныя сыны. За выняткам трох яцвягаў, усе даводзіліся вялікаму князю сваякамі, хоць і яцвяжскія князі, пры жаданні акрэсліць з ім роднасць, былі сваякамі па жонцы. Жмудскі князь Трайнат быў сястрыніч, полацкі князь Таўцівіл і віцебскі князь Ердзівіл — братанічы, гальшанскі князь Гердзень — стрыечны братаніч, крэўскі князь Даўмонт, самы малады з князёў у гэтым паходзе, таксама пляменнік, але траюрадны. Міндоўг вылічыў, што Даўмонту толькі крыху перайшло за дваццаць. Дзяволтаўскія князі Люмбель, Лугайла і Гаторп сядзелі на такіх дробных удзелах, што сваяцтва патрабавала ўзгадкаў пра дзядоў трэцяга калена. Са сваякоў не было на гэтай вайсковай радзе толькі зяця, Шварна Данілавіча, але ён вёў свой холмскі полк на мазаўшанаў па Бугу ад Берасця.

Вялікі князь паведамляў цяпер тое, што раней трымалася ў таямніцы: адначасна з імі пойдуць на мазураў з поўначы прускія дружыны Геркуса Мантуса. Іхная першая мэта — Цэханаў. Літва, жмудзь і яцвягі рухаюцца на Візну і па Нарэву — на Пултуск. На сутоку Нарэва з Бугам яны сустрэнуцца з валынскай руссю Шварна, і напрыканцы паходу спаляць галоўнае гнездзішча мазураў — Плоцк. А тады пойдуць дамоў з палонам і лупамі...

Мажліва, нагадаў Міндоўг пра лёс, нехта з іх не вернецца. Таму і трымаецца літва старадаўняга звычая паважнай размовы перад наездам, што хтосьці назаўжды застанецца ў чужой зямлі, а хто — зараз невядома. Нехта адзін ці некалькі з семнаццаці бачыць, слухае ўсіх і сам гаворыць з усімі апошні раз. Магчыма, гэта будзе ён, вялікі князь Міндоўг, ці малады Даўмонт, ці мужны Трайнат, ці зяць вялікага князя Шварн, ці яцвяжскі ўладар Скамонд. Невядомасць лёсу вызначана для чалавека багамі. Пасля іхнага прысуду багіня смерці ставіць на азначанае сэрца пячатку апошняга дня. Ніхто не гіне раней ці пазней часу, акрэсленага багіняй. Сёння яна значыць тэўтонскіх прыхвасняў — мазураў, і наезд засведчыць, каго з іх яна мяціла магільным знакам...

Паляну, на якой стаяў намёт, гарэў агонь і радзіліся князі, аточвала варта, а навокал днявала пяцітысячнае наваградскае апалчэнне — самае вялікае ў агульным войску і адданае Міндоўгу. За плячамі князя сядзелі два верныя яму баярыны: наваградскі ваявода Сірвід Рушковіч і разанскі выгнанец Астап — палявы ваявода ў паходах, найбліжэйшы князеў радца ў мірны час. На гэтай сустрэчы абодва назіралі, каб ніхто з маладых князёў раптам не выцягнуў з похваў меч. І сам Міндоўг, і абодва ваяводы ведалі, што з шаснаццаці князёў сама меней трое ненавідзелі яго і пры зручным выпадку не марудзілі б забіць, астатнія прынялі б такі ўчынак без абурэння, а можа і ўхвалілі. Але зручнага выпадку заўжды насцярожаны Міндоўг не да-

# ЗДАНЬ ЧОРНАГА ШЛЯХУ

Гістарычна-прыгодніцкая аповесць

У нашых старадаўніх судовых дакументах ёсць некалькі згадак пра суддзю Ваньковіча, хоць хутчэй, відаць, ён быў возны, гэта значыць вышукваў і прывозіў злачынцаў на княжацкі суд, можа і сам калі, змушаны абставінамі, меўся выносіць смяротны прысуд. Найбольш слынную справу правёў ён у Ашмянскім павеце, стагоддзі захоўвалася памяць аб ёй у паданнях тутэйшага люду.

А пачалася гэтая жахлівая гісторыя, як засведчыў тагачасны судовы натарый, у 1501 годзе, калі аб'явілася ў Ашмянскім павеце злачынная шайка. Хапала тут збояў і да яе, і прыблудных, і мясцовых, паколькі кожны другі гаспадар лічыў не толькі за права, але за абавязак абадраць на бальшаку падарожнага ці ездака, хоць бы світку з яго зняць, калі не меў пры сабе грошай. Аднак новая зграя рознілася ад іншых рабаўнікоў звярынай лютасцю. Рэдкі месяц абыходзіўся цяпер без жорсткага забойства. Літасці разбойнікі не мелі, аднолькава вешалі на дубах багатага пана і згаладалага пагарэльца, старую і маладзіцу. Груганы, маючы штотыдзень такі крывавы пачастунак, аблюбавалі

віленскі шлях ад Ашмянскага замка да Медніцкага, рассяліўшыся хеўрамі на дрэвах ўздоўж усяго гасцінца. Праз два гады старая ўтульная дарога набыла новую пагрозлівую назву — Чорны, ці Разбойніцкі шлях, якая і ўвашла ў звычны спажытак, бо чорнымі хмарамі віселі над дарогай зграі выгадаваных на чалавечыне варон. Шляхта зачынялася па дварах, лютыя ваўкарэзы каштавалі болей за карову. Але і агароджаная шчыльным палісадам сядзіба з тузінам псоў часцяком не абараняла ад нападу крывасмокаў. Калі збоі рабавалі ўгледжаны двор, усе яго насельнікі пазбаўляліся жыцця, быццам смяротныя пакуты людзей прыносілі бойлам радасць і асалоду. Зімой жыццё прыспакойвалася, але як толькі сыходзіў снег, зелянела рунь, выходзіла на атаву скаціна, шайка зноў абвяшчала пра сябе жахлівымі забойствамі.

Неадступны страх — вось галоўнае пачуццё, з якім ашмянскія насельнікі жылі з 1501 па 1507 год. Часы гэтыя былі адзначаны для ўсяго Віленскага ваяводства войнамі з маскоўцамі, наездамі крымскіх загонаў, якія ахвоціліся на дзяўчат і маладых жанок, асабліва блакітнавокіх і залатавалосых — лепшы тавар для Бахчысарая. У дадатак да такіх бедстаў іншаземнага паходжання, на ашмянскім абшары лютавала і свая, магчыма, горшая, паколькі разбойнікі ў палон нікога не бралі і нават красунь не ўводзілі на продаж, а ўсім аддзялялі душу ад цела, нібыта мелі д'ябальскае даручэнне ачысціць павет ад чалавечай прысутнасці. У Вільню да Яго міласьці вялікага князя Аляксандра

# БРЫГІТКІ

Апавяданне

Апошнія колькі гадоў я болей часу жыву на вёсцы, як некаторыя лічаць, — «на дачы». Хоць ніякая гэта не дача, а стары дамок з грубкай, які я набыў у знаёмага за пяцьсот даляраў, з невялікай сядзібай, засаджанай вішнямі. Мне тут утульна, бо ніякага бурлівага жыцця ў гэтай вёсцы няма. Яна не проста малая і неперспектыўная. Яна трымаецца толькі таму, што жыхарству ейнаму — чатыром бабкам і аднаму старому — Бог даў моцнае здароўе. З павагі да высакародных метафараў, можна абвясціць, што яны маюць місію захаваць родную мясціну яшчэ на дзясятак, дай Божа, гадоў сярод вясковых паселішчаў, якія ўлічваюцца адміністрацыяй раённага маштабу.

Я маладзейшы за гэтых чатырох бабак і дзеда, хоць і не малады, і мне ў мае сталыя гады ўсё адно дзе жыць — я такі ж малаперспектыўны, як і яны, і гэтая вёска... Што ў гэтай вёсцы з паказальнай назвай Забалацце, што ў Парыжы — усюды мы ўжо аднолькава непатрэбныя. Наш час мінуў. Мы ў вачах маладзейшых падаткаплацельшчыкаў — неўміручыя паразіты на пенсійным фондзе. Мяркую, гэткай жа думкі тры-